2015 году принят ряд мер, направленных на создание организационной вертикали, нового нормативного обеспечения деятельности, а также расширения материально-технической базы. В частности, согласно принятой Концепции развития и совершенствования деятельности кинологической службы таможенных органов Республики Беларусь до 2020 года в 2015 году разработан план реализации Концепции, предусматривающий принятие ряда мер для улучшения подготовки специалистов-кинологов. Принято новое Положение о кинологической службе таможенных органов Республики Беларусь, определяющее порядок использования и обучения, содержания, применения и комплектования кинологических подразделений служебными животными [5].

Таким образом, в Республике Беларусь активно развивается деятельность по созданию структур, которые осуществляют подготовку, переподготовку и повышение квалификации специалистов-кинологов и подготовку служебных собак.

**Литература**


1. *Аверьянова Т. В., Белкин Р. С., Корухов Ю. Г., Российская Е. Р.* Криминалистика. Москва. 2000.
2. Ищенко Е.П., Криминалистика. Москва. 2011.
3. Интернет-адрес: http://www.mil.by/ru/forces/kc/.
4. Интернет-адрес: http://gpk.gov.by/platnyie-uslugi/kinologicheskiy-%D1%81entr/.
5. Интернет-адрес: http://www.gtk.gov.by/ru/activity/kinologicheskaya_sluzba/kinologiceskaja-sluzhba-tamozhennyx-organov-itogi-2015-goda_i_6728.html.


## КАНСТЫТУЦЫЙНАЕ ПРАВА ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА (ПА СТАТУТАХ 1529, 1566, 1588 гг.)


**В. М. Бічун**


У прэамбуле дзеючай Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь гаворыцца аб шматвяковай гісторыі развіцця беларускай дзяржаўнасці, якая ўзнікла ў далекай старажытнасці і развівалася ў рэчышчы агульнаеўрапейскай культуры.

Феадальная Беларусь – гэта велізарны гістарычны пласт, якому характэрны цікавыя з’явы і працэсы. У XV–XVI стагоддзях завяршаецца працэс фарміравання беларускай народнасці, у сферы дзяржаўна-палітычнай складваецца саслоўна-прадстаўнічая манархія з яе характэрнымі рысамі і палітычнымі атрыбутамі, адбываюцца значныя сацыяльна-эканамічныя пераўтварэнні, якія завяршаюцца цэлай серыяй рэформаў, у

тым ліку і прававой. Вынікам адзначаных працэсаў з’явілася высокаразвітая прававая сістэма [1, с. 56].

Што датычыцца развіцця канстытуцыйнага феадальнага права Беларусі, то яно праходзіла пад уздзеяннем унутраных і знешніх сацыяльна-эканамічных і палітычных працэсаў. Звычаёвае права, якое існавала ў старажытнасці на асобных землях Беларусі, было пазбаўлена адзінства, мела асаблівасці ў рэгуляванні праваадносін. Паступова, на працягу XIV–XVI стст., паралельна з працэсам кансалідацыі асобных земляў-княстваў у складзе Вялікага Княства Літоўскага, праходзіў працэс уніфікацыі права з актыўнай распрацоўкай новых прававых нормаў, якія адпавядалі больш складаным умовам сацыяльна-эканамічнага развіцця дзяржавы. У гэты перыяд зараджаюцца асновы беларускага канстытуцыяналізму.

Канешне, найбольшае значэнне ў развіцці канстытуцыйнага права адыгралі Статуты Вялікага Княства Літоўскага 1529, 1566, 1588 гг.

Статут 1529 года ўнёс шмат новага ў развіццё сусветнай прававой думкі. Самае галоўнае, што яго адрознівала ад заканадаўчых актаў іншых дзяржаў, гэта яго канстытуцыйная накіраванасць. Першыя тры раздзелы Статута ўключалі ў асноўным нормы канстытуцыйнага характару, хаця яны змяшчаліся і ў іншых раздзелах.

Элементамі канстытуцыяналізму ў Статуце 1529 года з’яўляюцца нормы-прынцыпы, што замацоўваюць у прыватнасці прэзумпцыю невінаватасці (артыкул 7 першага раздзела), роўнасць усіх перад законам і адзіным судом (артыкул 9), а таксама нормы-правілы ў сферах палітычнай, эканамічнай, сацыяльнай, экалагічнай як нараджэнне інстытутаў і галін права і заканадаўства.

Статут замацаваў асновы грамадска-палітычнага ладу дзяржавы, парадак утварэння, склад і паўнамоцтвы некаторых дзяржаўных і судовых органаў, прававое становішча розных катэгорый насельніцтва і іншае. У ім утрымліваліся шматлікія канстытуцыйныя нормы, аднымі з важнейшых сярод якіх былі тыя, якія абмяжоўвалі ўладу вялікага князя.

У Статуце ўдакладняецца норма аб недатыкальнасці асобы. Статут таксама ўдакладняе і развівае палажэнні, якія раней былі выкладзены ў агульназемскіх граматах: аб ахове тэрыторыі дзяржавы, вайсковай службе і шмат іншае.

Статут 1566 г. замацоўваў і паўтараў на больш высокім юрыдычным узроўні палажэнні аб адзінстве права на ўсёй тэрыторыі дзяржавы і для ўсіх падданых (хоць па феадальнаму праву яно не магло быць і не было роўным для ўсіх катэгорый насельніцтва), дзяржаўным суверэнітэце, прыярытэце пісанага права, абмежаванні ўлады вялікага князя і г.д. [4, с. 157].

Канстытуцыйнаму праву, як і ў папярэднім Статуце 1529 г., былі прысвечаны першыя тры раздзелы новага звода законаў дзяржавы, хаця канстытуцыйныя нормы ўтрымліваліся і ў іншых раздзелах. Ад імя вялікага князя Статут 1566 года забараняў карыстанне звычаёвым правам і патрабаваў з гэтага часу кіравацца толькі статутавымі нормамі. Ён не толькі больш дакладна і поўна рэгламентаваў дзейнасць такіх вышэйшых органаў дзяржавы, як вялікі князь і рада, але і замацаваў заканадаўчую функцыю сойма. Закон гаварыў аб складзе і кампетэнцыі сойма, аб парадку абрання павятовых дэпутатаў на сойм, аб дзейнасці павятовых соймікаў – органаў шляхецкай дэмакратыі. Улада князя абмяжоўвалася не толькі радай, але і соймам, без згоды якога ён не меў права ўводзіць новыя падаткі, прымаць новыя законы, пачынаць вайну (р.2, арт.2) [3].

Упершыню ў статутавых нормах праяўляецца тэндэнцыя аддзялення судовай улады ад выканаўчай.

Статут 1566 г. замацаваў шмат новых і прагрэсіўных палажэнняў, хаця, перш за ўсё, клапаціўся аб прывілеях шляхты і фактычна афармляў галоўную ролю буйных феадалаў у дзяржаве. Менавіта ў гэтым і праявілася супярэчлівасць Статута: з аднаго боку ён абвяшчаў самыя прагрэсіўныя ідэі і прынцыпы, звяртаючыся да ўсяго насельніцтва і ўдакладняючы: «як да багатых, так і да бедных», «як да людзей вышэйшага стану, так і да людзей ніжэйшага стану», а з другога боку, – перш за ўсё, абараняў інтарэсы феадалаў. Будучы законам феадальнай дзяржавы, Статут увабраў у сябе ўсе характэрныя рысы і супярэчнасці тагачасных грамадскіх адносін. Аднак яго палажэнні адначасова адлюстроўвалі і паступальную тэндэнцыю ў развіцці грамадства.

Трэба адзначыць, што Статут 1566 г. на беларускіх землях дзейнічаў да прыняцця новага звода законаў дзяржавы – Статута 1588 года, а на ўкраінскіх землях далучаных да Польшчы ў 1569 годзе – Валынскім, Кіеўскім, Брацлаўскім ваяводствах (за выключэннем некаторых артыкулаў) ён працягваў дзейнічаць пад назвай «Валынскі Статут» і пасля ўвядзення ў дзеянне Статута 1588 года.

Трэці Статут 1588 г. у параўнанні з двума першымі меў не толькі больш значны аб’ем (487 артыкулаў, 14 раздзелаў), але і больш дасканалую сістэму размяшчэння прававога матэрыялу. Кадыфікатары дзяржавы распрацавалі і ў гэтым Статуце ўдасканалілі ўласную сістэму права, якая адрознівалася ад традыцыйнай рымскай сістэмы права і грунтавалася на новых прынцыпах, уласцівых пераходнаму перыяду ад сярэдневякоўя да новага часу. Увесь Статут пранізвала ідэя прававой дзяржавы, адной з падстаў якой быў замацаваны ім прынцып падзелу ўладаў – заканадаўчая ўлада належыла сойму, выканаўчая – вялікаму

князю і радзе, судовая – новым, створаным у выніку судовай рэформы, судовым органам.

Статут 1588 года пераўзыходзіў папярэднія законы шырыней прававой рэгламентацыі амаль усіх, маючых месца у феадальнай дзяржаве, праваадносін. Па сутнасці Статут з’яўляўся Канстытуцыяй дзяржавы.

Першыя тры раздзелы яго ў асноўным былі прысвечаны нормам канстытуцыйнага права, утрымлівалі гэтыя нормы і іншыя раздзелы Статута. Закон замацаваў такія важныя канстытуцыйныя прынцыпы, як суверэнітэт дзяржавы і народа, роўнасць усіх свабодных людзей перад законам, права чалавека на ўласнасць, на ахову яго жыцця, гонару, маёмасці, на судовую абарону і іншае. Для шляхты абвяшчалася права свабоднага выезду за межы дзяржавы, права прадстаўніцтва ў органах дзяржаўнай улады і кіравання [2].

Заканадаўца, зыходзячы з самых прагрэсіўных ідэй свайго часу, замацаваў у Статуце палажэнне, якое мела месца у папярэдніх законах, аб тэрытарыяльнай цэласнасці дзяржавы і яе недатыкальнасці (р.3,арт.1), тым самым абвясціўшы суверэнітэт Вялікага княства Літоўскага насуперак Люблінскай уніі. Закон увогуле абавязваў гаспадара вярнуць усё тое (меліся на ўвазе землі), што было калісьці «разобрано» і «упрошено» іншымі дзяржавамі. Патрабаванне вяртання земляў, захопленых Польшчай у Вялікага княства Літоўскага, выступае ў 1, 4, 5 артыкулах трэцяга раздзелу Статута з такой жа выразнасцю і дакладанасцю, як і у папярэднім Статуце 1566 года, які быў прыняты да заключэння Люблінскай уніі. Адлюстроўваючы імкненне заканадаўцы да незалежнасці, у Статут 1588 года былі уключаны нормы, якія забаранялі вялікаму князю надзяляць землямі і пасадамі іншаземцаў.

Палажэнні Статута сведчаць, што ён быў дастаткова тыповым феадальным законам і таму ўвабраў у сябе ўсе характэрныя рысы і супярэчнасці тагачаснага грамадства. Перш за ўсё ён абараняў асобу феадала і яго ўласнасць. Адначасова нормы гэтага закона адлюстравалі паступальную тэндэнцыю ў развіцці феадальнага грамадства. Аб гэтым сведчаць усе тыя прагрэсіўныя ідэі і прынцыпы, выпрацаваныя чалавецтвам на працягу свайго існавання, якія заканадаўча замацаваў Статут. Многія палажэнні яго шмат у чым апярэдзілі свой час. Статут 1588 года паслужыў узорам кадыфікацыі заканадаўства ў іншых краінах.

З’яўленне Статутаў 1529, 1566, 1588 гадоў стала вынікам і сведчаннем высокага ўзроўню прававой культуры беларускага народа і прыкладам кадыфікаціі заканадаўства для іншых дзяржаў.

Працэс кансалідацыі старажытных беларускіх земляў-княстваў у адну агульную дзяржаву і складаныя ўзаемаадносіны з суседнімі дзяржавамі

садзейнічалі развіццю канствытуцыйнага права. Ужо ў XV стагоддзі агульназемскія граматы, якія з'яўляліся феадальнымі хартыямі, замацавалі важнейшыя канстытуцыйныя нормы і прынцыпы, у тым ліку суверэнітэт дзяржавы. Статуты XVI стагоддзя абагульнялі і развівалі далей канстытуцыйныя палажэнні папярэдніх заканадаўчых актаў. Статут 1588 года, які дзейнічаў на працягу XVI– пачатку XIX стагоддзяў, з'яўляўся па сваёй сутнасці сапраўднай Канстытуцыяй дзяржавы.

**Літаратура**


1. *Гудавичюс Э.* История Литвы с древнейших времен до 1569 года. Москва, 2005.
2. *Доўнар Т. І.* Канстытуцыйнае права Беларусі феадальнага перыяду (па Статутах Вялікага княства Літоўскага 1529, 1566, 1588 г.г.). Мінск, 2001.
3. *Доўнар Т. І.* Статут Вялікага кнаства Літоўскага 1566 года / Рэдкалегія Т.І. Доўнар, У.М. Сатолін, Я.А. Юхо. Мінск, 2003.
4. *Доўнар Т. І.* Характэрныя рысы і асаблівасці прававога развіцця Беларусі на важнейшых гістарычных этапах // Весн. Беларус. ун-та. Сер 3. 2009. № 1.


## МЕЛКОЕ ХУЛИГАНСТВО КАК ВИД АДМИНИСТРАТИВНОГО ПРАВОНАРУШЕНИЯ


**Ю. В. Василенко**


Статья 17.1 Кодекса об административных правонарушениях [1] (далее – КоАП) предусматривает административную ответственность за нецензурную брань в общественном месте, оскорбительное приставание к гражданам и другие умышленные действия, нарушающие общественный порядок, деятельность организаций или спокойствие граждан и выражающиеся в явном неуважении к обществу.

Данные противоправные деяния одни из самых распространенных в практической деятельности правоохранительных органов. Только за январь 2015 год в Республике Беларусь органами внутренних дел было вынесено 9 690 постановлений об административных правонарушениях, что на 12,6 % больше, чем за аналогичный период предыдущего года [6]. К примеру, для более детального определения важности существующих проблем, можно привести статистику по более мелкой административно-территориальной единице государства. Так, в период с 21 по 27 марта 2016 года сотрудниками Солигорского РОВД было задержано около 80 лиц по подозрению в совершении мелкого хулиганства, среди них 12 женщин [5]. На основании вышеизложенного хочу выделить основные проблемы по применению на практике данной статьи:

1. Проблема применения 17.1 в случаях с семейными скандалистами;